■ Фотаздымак з гісторыяй

# ДЗВЕ АРМІІ, ЯКІХ УЖО НЯМА

**Памяць пакаленняў, сувязь паміж продкамі і нашчадкамі — тыя рэчы, для якіх не існуе бар'ераў у часе, прасторы або спосабе стасункаў. Гэта яшчэ раз пацвердзіў у сваім лісце ў рэдакцыю Васіль Рослаў: «Чытаю газету найперш з прафесійнай зацікаўленасці і службовых абавязкаў, у прыватнасці, адсочваю аб'явы аб продажы нерухомасці і абсталявання, але калі нейкая іншая інфармацыя зацікавіць, не праходжу міма. Вось звярнуў увагу і на матэрыялы ў рубрыцы «Фотаздымак з гісторыяй», вырашыў распавесці сваю гісторыю».**



Розніца паміж «старэйшым» і «малодшым» здымкамі, якія дасылаў у нашу рубрыку Васіль Міхайлавіч, складае больш чым 65 гадоў. І ўсё ж яны шчыльна і нязлоўна звязаныя — і не толькі таму, што на іх сфатаграфаваны дзед і ўнук, але і таму, што з'яўляюцца доказам выразу «гісторыя паўтараецца».

«На першым фота — мой дзед Васіль Лукіч (2-і злева ў верхнім радзе), які служыў яшчэ ў царскай арміі дзесьці ў Сібіры. На другім, з дэмбельскага альбома — я сам, яго ўнук (на здымку я адзіны без фуражкі), а фотаздымак зроблены ў 1984 годзе пасля службы ўжо ў Савецкай Арміі — служыў я, дарэчы, у Беларусі. І ведаеце, чым яшчэ, акрамя нашага сваяцтва і таго, што ніводная з гэтых армій цяпер не існуе, блізкія гэтыя здымкі? Іх злучае факт, не зусім характэрны для XX стагоддзя — стагоддзя двух сусветных, грамадзянскай, інтэрнацыянальнай (у Афганістане) войнаў і яшчэ мноства ваенных канфліктаў. Пры ўсім гэтым, як ні дзіўна, ні дзеду (1890 года нараджэння), ні майму бацьку Міхаілу Васільевічу, які служыў на Урале ў 50-х гадах, ні мне, на шчасце, не давялося прымяніць у жыцці тое, чаму нас вучылі ў арміі — ваяваць.



Але няма, напэўна, у нас ніводнай сям'і, якую не закранула б тая ці іншая вайна. На фронце ў снежні 1943 года прапаў без вестак мой другі дзед, бацька мамы Крываносаў Іван Іванавіч 1909 года нараджэння. Яго жонка, мая бабуля Надзея Лявонаўна, узнагароджана медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны». А мой стрыечны брат, Рослаў Аляксандр Іванавіч, ваяваў у Афганістане... І ўсё гэта — не толькі сямейная, але і гістарычная памяць, якую трэба ведаць, берагчы і захоўваць, каб найгоршыя старонкі гісторыі ўсё ж не паўтараліся».

❍ ❍ ❍

*Шаноўныя чытачы! Мы працягваем гартаць сямейныя альбомы разам. Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце, калі ласка, на рэдакцыйную пошту альбо электронную скрыню info@zviazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.*

*Увага! Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.*

# ЯК ДЗІЦЯ СПАВІВАЦЬ,

## або Першая вопратка




**Пялёнкі дзіцяці, тое, у чым яно расце і развіваецца на працягу першага года жыцця, у народнай культуры параўноўвалі з палотнамі, якія выкарыстоўвалі ў час вяселля ці пахавальнага абраду. Лічылася, што непасрэдны кантакт дзіцяці з пялёнкамі і іншым адзеннем мае пэўны ўплыў на яго будучы характар, здароўе і ўдачу. Таму да іх вырабу і выкарыстання існаваў цэлы шэраг патрабаванняў.**

1 Звычайна пялёнкі шылі са старой пасцельнай бялізны або адзення тых дамачадцаў, чый характар і стан здароўя не выклікалі трывогі.

2 А вось для абраду хрышчэння пялёнкі шылі з новай, абавязкова белай (светлай) тканіны, упрыгожвалі іх вышыўкай, карункамі. Спавівач (пояс, якім спавівалі дзіця) быў абавязкова чырвонага колеру. У царкве хросная маці павінна была на працягу ўсяго абраду трымаць пялёнкі і спавівач, каб такім чынам «адзенне» хрэсніка таксама было асвячоным. Дарэчы, надалей «хрэсьбінныя» пялёнка і спавівач лічыліся надзейным абярэгам для немаўляці: іх клалі ў калыску, бралі з сабой, калі надоўга выносілі дзіця з хаты.

3 Пялёнкі, у якіх хрысцілі дзіця, у штодзённым жыцці болей не выкарыстоўвалі. Іх прасавалі і захоўвалі, каб скарыстаць у час хрышчэння наступнага дзіцяці. Казалі, што дзеці, хрышчоныя ў адным адзенні, будуць сябраваць паміж сабой і клапаціцца адно аб адным. Гэтак жа ставіліся да іншага дзіцячага адзення, цацак.

4 Нашы прабабулі лічылі, што тугое спавіванне надасць дзіцяці стройнасць фігуры і будзе спрыяць яго росту. Стараліся, каб на працягу першых 9 дзён дзіця спавівала бабка-павітуха.

5 З пялёнкамі прыходзілі жанчыны ў «адведкі», наогул пялёнкі былі абавязковым падарункам для бацькоў дзіцяці.

6 На працягу 40 дзён пасля нараджэння дзіцяці пялёнкі не выносілі сушыць на двор. Наогул, мыць і сушыць пялёнкі дазвалялася толькі раніцай. Лічылася: той, хто пакідаў пялёнкі на двары пасля заходу сонца, мог наклікаць на дзіця невылечныя хваробы, дзіця магло страціць сон, стаць плаксівым.

7 Пялёнкі забаранялася выкарыстоўваць для іншых мэтаў: у іх можна было толькі спавіваць дзяцей.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# 5 ФІЛЬМАЎ для сямейнага прагляду

**Ганна АНДРУШЭВІЧ, рэдактар кінакампаніі СТБ (Масква):**

**1. Поўнаметражны анімацыйны фільм «Ку! Кін-дза-дза».** Пачаткоўец дыджэй Толік і сусветна вядомы віяланчэліст Уладзімір Чыжоў сустракаюць на шумнай маскоўскай вуліцы босага чалавека, націскаюць на кнопку дзіўнай прылады і перамяшчаюцца на пустынную планету Плюк... Тактак, гэта анімацыйны рымейк знакамітага фільма Георгія Данелія. Мне падабаецца сучаснае прачытанне гэтай гісторыі: актуальнасць яна не страціла, быць можа, яшчэ і набыла новыя сэнсы.

**2. Фільм «5 нявестаў» Карэна Аганесяна.** Часта кажуць, што цяпер камедыі не ўмеюць здымаць. Не ведаю, асабіста я глядзела гэты фільм у 2011 годзе на Маскоўскім кінафестывалі і смяялася ад усёй душы. Наіўнае і добрае кіно ў стылістыцы пасляваенных карцін — пра тое, як лётчыкі ў 1945 годзе хацелі жаніцца і баяліся, што ўсіх нявестаў разбяруць.

**3. «Пра Фядота-стральца, удалога малайца».** Яшчэ адзін поўнаметражны анімацыйны фільм — экранізацыя казкі Леаніда Філатава. Тут усё сышлося: і выдатны літаратурны матэрыял, і цудоўнае яго ўвасабленне. Чым яшчэ падабаецца мне гэта анімацыя — яна з двайным дном, таму і дзеці, і дарослыя знойдуць для сябе штосьці каштоўнае.

**4. «Дачка якудзы» Сяргея Бадрова-старэйшага і Гукі Амаравай.** Нягледзячы на грозную назву, гэта прыгодніцкая камедыя пра адну маленькую японскую дзяўчынку, якая згубілася недзе паміж Уладзівастокам і Іркуцкам. Ёй трэба знайсці бацьку, чалавека неблагога, але па праве нараджэння вымушанага быць важаком якудзы. У выніку дзяўчынка знаходзіць і тату, і дарогу дамоў, і сяброў.

**5. «Іван-царэвіч і Шэры Воўк»** — зноў поўнаметражная анімацыя для дзяцей і дарослых. Гэты фільм працягвае стылістыку мультфільмаў пра асілкаў, але па сюжэце — зусім іншая гісторыя. Запамінальныя песні, каларытныя персанажы, жарты, над якімі працаваў вядомы квартэт «І» — атрымалася вельмі здарова!



■ Парады псіхолага

# БЕЗНАДЗЕЙНА... ХАТНІ,

## або Што рабіць з «несадкоўскім» дзіцем?



**На пытанні чытачоў адказвае старшы выкладчык кафедры псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, псіхолаг-кансультант Алена ОСІПАВА.**

*«Гэтым летам у мяне заканчваецца водпуск па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, таму да дзіцячага садка мы вырашылі падрыхтавацца крыху загадзя: хадзім у яслі з сакавіка. Але «хадзім» — гэта насамрэч гучна сказана. У суме не набіраецца і 2 тыдняў, якія мой малы прабыў у групе. І гэта пры тым, што я адводжу яго ў садок максімум на дзве гадзіны, больш ніяк не атрымліваецца — ён пачынае плакаць наўзрыд, агрэсіўна сябе паводзіць, іравецца да дзвярэй, каб апранацца і ісці дамоў. А дома з ім усё нармальна, у двары лёгка ідзе на кантакт, гуляе з іншымі дзецьмі. Напэўна, маё дзіця — «несадкоўскае». Што ж рабіць — можа, уладкаваць ў садок, куды ходзіць сын, памочнікам выхавальніка, каб быць побач з ім?»*

**Вольга Максімовіч,** *г. Мінск.*

Вольга, сапраўдных «несадкоўскіх» дзяцей, на шчасце, не так ужо і шмат. У асноўным гэта дзеці з цяжкімі хранічнымі хваробамі. У прынцыпе, усе астатнія дзеці, нягледзячы на бясконцую разнастайнасць іх індывідуальных асаблівасцяў, суцэльна «садкоўскія». І трывожным, і аслабленым, і агрэсіўным, і чуллівым дзіцячы садок не супрацьпаказаны. Больш за тое — адхіленні ў паводзінах дзіцяці толькі ўзмацняюць неабходнасць у дзіцячым асяроддзі як важнай умове адаптацыі ў грамадстве.

Усякае змяненне ўмоў жыцця, што патрабуе адаптацыі, з'яўляецца моцным стрэсам для арганізма. Стрэс, у прыватнасці, праяўляецца ў тым, што дзіця слабее, у яго зніжаецца супраціўляльнасць да інфекцый. Да таго ж у дзіцячым калектыве значна вышэйшая верагоднасць інфіцыравання дзіцяці, чым дома. Усякі здаровы малы можа быць носьбітам мікраарганізмаў, на якія ён сам не рэагуе, бо для яго яны «свае», а для іншага яны могуць паслужыць прычынай хваробы. Мамы ж звычайна думаюць, што дзіця ў садку «прастудзілі».

Самае важнае, што варта мець на ўвазе: прычына пастаянных прастуд і хранічных ВРЗ часта не медыцынская, а псіхалагічная. Адзін з вядомых механізмаў псіхалагічнай абароны так і называецца — уцёкі ў хваробу. Толькі не трэба думаць, што дзіця прастуджваецца знарок, бо марыць застацца дома. Гэтае жаданне падсвядомае, ён не разумее сутнасці свайго памкнення. І арганізм падпарадкоўваецца гэтай утоенай тэндэнцыі, пачынае дэманстраваць дзіўную слабасць, з лёгкасцю трапляе пад усякі адмоўны ўплыў, адмаўляецца супраціўляцца вірусам. Таму меры па загартоўванні і ўмацаванні арганізма, безумоўна, апраўданыя і мэтазгодныя; але не меншае значэнне маюць бацькоўскія намаганні па аднаўленні душэўнай гармоніі дзіцяці.

**Адхіленні ў паводзінах дзіцяці толькі ўзмацняюць неабходнасць у дзіцячым асяроддзі як важнай умове адаптацыі ў грамадстве.**

Часцей за ўсё схільныя да псіхалагічна цяжкай адаптацыі да дзіцячага садка дзеці, якія яшчэ дома ніяк не адпускалі маму ад сябе, а яшчэ больш верагодна, што мама сама мае павышаную трывожнасць і не адпускала ад сябе дзіця...

Якія захады могуць зрабіць бацькі ў такой сітуацыі? Па-першае, разабрацца са сваім уласным станам і сваімі страхамі: пакуль дзіця будзе адчуваць трывогу маці, яно будзе «несадкоўскім». Па-другое, неабходна мець упэўненасць, што не толькі ваша дзіця «падыходзіць» дзіцячаму садку, але і канкрэтны садок падыходзіць вашаму дзіцяці. Бацькам трэба пераканацца, ці дастаткова спрыяльная і камфортная для дзіцяці атмасфера выбранай дашкольнай установы. Важна таксама, якое ўражанне пакідаюць выхавальнікі. Калі выхавальніца вам несімпатычная, гэта яшчэ не значыць, што яна дрэнны прафесіянал і благі чалавек. Але гэта нагода задумацца, бо ваша першая, эмацыйная, ацэнка, хутчэй за ўсё, сведчыць пра сур'ёзнае разыходжанне ў поглядах, каштоўнасцях, самім стылі паводзін выхавальніка і бацькоў. І гэту няўзгодненасць дзіця можа ўспрымаць абвострана, пакутліва падладжваючыся то пад адзін, то пад другі стыль. Калі атмасфера пэўнай дашкольнай установы вас не задавальняе, сур'ёзна падумайце аб пераводзе дзіцяці ў іншы садок. Але гэты крок прымальны толькі аднойчы ці двойчы. Калі ж у пошуках лепшага месца вы ператорыце жыццё дзіцяці ў качавое, то тым самым пазбавіце яго стабільнасці і ўведзяце ў бясконцы стрэс.



Не трэба пераацэньваць негатыўныя перажыванні дзіця. Вопытныя педагогі заўважаюць, што нават тыя дзеці, якія з рыданнямі ўпрошваюць маці не пакідаць іх у садку, праз некалькі хвілін пасля яе адыходу супакойваюцца і ўключаюцца ў гульні з сябрамі. Калі ж дзіця адчувае, што маці перажывае страх за яго, ці калі пратэстамі яму ўдалося пасеяць у сэрцы маці сумненні ці нават адчуванне віны, то яно з падвоенай настойлівасцю прымецца ўздзейнічаць на маці ўсімі даступнымі сродкамі. Каб гэтага пазбегчы, можна дамовіцца аб тым, каб дзіця ў садок адводзіў бацька — таты наогул больш цвяроза ставяцца да эмацыянальных рэакцый дзяцей.

Калі падчас дэкрэтнага водпуску вы пастаянна, неадлучна заставаліся побач з дзіцем, то цяпер пастарайцеся, каб з ім часцей былі тата, бабуля ці дзядуля. Прывучайце дзіця ненадоўга адпускаць вас, паступова павялічваючы працягласць сваёй адсутнасці. На гэты час важна, каб іншыя сваякі займалі малога цікавымі для яго рэчамі. Вы робіце правільна, пашыраючы кола стасункаў свайго дзіцяці.

Але можа здарыцца і так, што, нягледзячы на ўсе намаганні, не ўдасца пераадолець непрыняцце дзіцем садка. Калі абсалютна відавочна, што дзіцяці ў садку дрэнна, і мінусы грамадскага выхавання пераважваюць усе плюсы, усё адно не спяшайцеся навешваць на малога ярлык безнадзейна «дамашняга». Каб атрымаць параду, як выйсці з сітуацыі, лепш звярнуцца да спецыяліста-псіхолага на вочную кансультацыю.

*У народзе кажуць: «МУЖЫК З ЖОНКАЙ СВАРЫЦЦА — У ГАРШКУ ТРАСЦА ВАРЫЦЦА».*

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.